

# Праз творчасць — аб істотным

Сярод лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта "За духоўнае адраджэнне" — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Калектыў узнагароджаны за актыўную дзейнасць у патрыятычным выхаванні моладзі і рэалізацыю праекта "Лінія памяці. Код вайны". Аб плённай працы распавяла рэктар установы Наталля Карчэўская.

## НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ

Умацаванню духоўна-маральных каштоўнасцей, заснаваных на традыцыях беларускага народа, ва ўніверсітэце надаюць асаблівую ўвагу. Там лічаць патрыятычнае выхаванне падмуркам будучыні краіны.

— Важнасць ідэалагічнай работы не толькі ва ўстанове адукацыі, але і ў любым калектыве цяжка пераацаніць. Практыка паказвае, што любоў да Радзімы, гатоўнасць плённа працаваць дзеля Бацькаўшчыны — гарантыя захавання суверэнітэту і незалежнасці краіны, — гаворыць Наталля Уладзіміраўна. — Мяркую, што залог паспяховасці грамадзянскага выхавання ў нашай установе — у шчырасці намераў. Патрыятызм — гэта перш за ўсё імкненне прыносіць рэальную карысць дзяржаве ў сілу магчымасцей.

## ПРЫ ПАДТРЫМЦЫ ПРЭЗІДЭНТА

Падчас цырымоніі ўручэння прэміі асобна быў адзначаны ваеннапатрыятычны праект "Лінія памяці. Код вайны", рэалізаваны калектывам БДУКМ. Гэта маштабны канцэрт-спектакль, у якім праз харэаграфію і музыку перадаецца думка: нельга дапусціць, каб паслядоўнікі нацызму вярнуліся на нашу зямлю. Аўтарам і галоўным балетмайстрам выступіла дацэнт кафедры харэаграфіі БДУКМ Вольга Наўроцкая.

Па словах Наталлі Карчэўскай, жаданне стварыць такі праект зарадзілася яшчэ ў 2021 годзе. Ажыццяўленне задумы стала магчымым дзякуючы падтрымцы Кіраўніка дзяржавы.

— Штуршок да ўзнікнення ідэі дало тое, што Генеральная пракуратура ўзбудзіла справу па факце генацыду беларускага народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Падрыхтавалі дакументы на атрыманне гранта Прэзідэнта ў галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры. У выніку ўвасобілі праект, — распавядае пра гісторыю стварэння спектакля-канцэрта Наталля Уладзіміраўна.

> Але ажыццяўленне любой задумы немагчымае без ініцыятыўных, шчыра зацікаўленых справай людзей і іх мэтанакіраванай працы. Над пастаноўкай "Лінія памяці. Код вайны" шчыравала каля 75 чалавек — танцоры і музыканты, мастакі па касцюмах, іншыя прафесіяналы.

— У падрыхтоўцы спектакля былі задзейнічаны студэнты і выкладчыкі нашага ўніверсітэта. Таксама далучыліся дзіцячыя харэаграфічныя калектывы: RDC з Мінска, Stay dance project з Рагачова, узорны ансамбль танца "Натхненне". Значны ўнёсак у агульную справу зрабілі і юныя чытальнікі — пераможцы рэспубліканскага конкурсу "Жывая класіка".




## УМАЦОЎВАЮЧЫ ПОСПЕХ

У выпадку са спектаклем "Лінія памяці. Код вайны" ўсё склалася найлепшым чынам. Мастацкі ўзровень, маштаб, а таксама шчырая глядацкая зацікаўленасць дазволілі праекту здабыць доўгае жыццё.

І хаця юныя танцоры сталеюць, учарашнія студэнты становяцца маладымі спецыялістамі, іх замяняюць новыя таленты. Ідэя работы па-ранейшаму актуальная — і паказы працягваюцца. У тым ліку ў іншым фармаце.

> — Калі дэманстрацыя поўнай версіі спектакля па-за нашай сцэнай — даволі цяжкая задача, то паказ яго асобных частак рэальны. Абраныя нумары праекта мы ўжо прадстаўлялі ў мемарыяльным комплексе "Трасцянец", у Брэсцкай крэпасці, а таксама ў рамках грамадска-культурнай акцыі "Марафон адзінства", — адзначыла Наталля Уладзіміраўна. — Пастаноўку ў арыгінальным варыянце публіка зноў убачыць у сакавіку. Мерапрыемствы будуць прысвечаны 80-годдзю Вялікай Перамогі.

## КАБ ПАМЯТАЛІ...

Распавядаць пра трагічныя падзеі мінулага на мове творчасці — неабходна. Рэктар БДУКМ упэўнена, што дзякуючы падобнаму асэнсаванню гісторыі распаўсюджваецца думка аб недапушчальнасці вайны.

— Часам бывае складана ўспрыняць страшную інфармацыю з публікацый у СМІ ці з навуковых работ. Тады на дапамогу прыходзяць творы мастацтва, здольныя крануць кожнага, — падкрэслівае Наталля Уладзіміраўна. — Успомнім карціны Міхаіла Савіцкага, што леглі ў аснову сюжэтнай канвы нашага спектакля. У свой час вялікі жывапісец асэнсаваў тэму стойкасці людзей у нечалавечых умовах, прыцягнуў грамадскую ўвагу да жахаў ліхалецця. У такім выпадку мастацтва выконвае выхаваўчую функцыю, нагадвае, што вайна — гэта страшна і што падобнае не павінна паўтарыцца.



Падчас канцэрта-спектакля

Данііл ПІЎКАРЭЦ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА